ПРАЛЕТАРЫІ УСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# Гомельскі ўніверсітэт

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, КАМІТЭТА ЛКСМБ
І ПРАФКОМАЎ ГОМЕЛЬСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА

№ 12 (607) | Субота, 13 красавіка 1985 года | Газета заснавана ў верасні 1969 года. Выходзіць раз у тыдзень | Цана 2 кап.

*Пазыўныя «Чырвонай суботы»*

## ПРАЦАВАЛІ З ЭНТУЗІЯЗМАМ

Уся наша краіна — вытворчыя калектывы прадпрыемстваў, працаўнікі сельскай гаспадаркі, работнікі устаноў — рыхтуюцца да свята камуністычнай працы — суботніка, прысвечанага 115-й гадавіне з дня нараджэння У. І. Леніна. І як заўсёды, прыме самы актыўны ўдзел у свяце працы і савецкае студэнцтва.

У лік камуністычнага суботніка ўжо 6 красавіка адпрацавалі камсамольцы нашай групы Р-23 гісторыка-філалагічнага факультэта. Дружна, арганізавана выйшлі яны пасля напружанага вучэбнага дня на ўборку тэрыторыі студэнцкага парку. З энтузіязмам працавалі ўсе без выключэння юнакі і дзяўчаты на чале з лабарантам кафедры нямецкай і французскай моў Святланай Фёдараўнай Карнаухавай. Сваім асабістым прыкладам яна задавала ўдарны тэмп у рабоце, і ўсе мы стараліся не адставаць ад яе, хутка і якасна выканаць даведзенае нам заданне.

**Святлана ГАЙДАМАКА,**
**камсорг групы Р-23 гісторыка-філалагічнага факультэта.**

*Завочная адукацыя: дасягненні, перспектывы*

## БЕЗ АДРЫВУ АД ВЫТВОРЧАСЦІ

**Л. Н. СЕЧКА,**
**прарэктар універсітэта па завочнаму навучанню, кандыдат педагагічных навук.**

Кожны з нас, натуральна, чуў, што веды завочнікаў значна слабейшыя, чым выпускнікоў дзённых аддзяленняў. Пэўная доля ісціны ў гэтым сапраўды ёсць. Думаецца, аднак, што справа тут не ў недахопах самой сістэмы завочнага навучання, якая існуе даўно і з'яўляецца найбольш адпрацаванай, а ў цяжкасцях арганізацыйнага характару.

Чалавек, які працуе ў школе, на вытворчасці і завочна набывае тэарэтычныя веды ў гэтай жа галіне, павінен быць у выніку падрыхтаваным не горш тых спецыялістаў, якія атрымалі адукацыю на дзённым аддзяленні. Студэнт-завочнік пазнае на практыцы сакрэты вытворчасці з самага пачатку навучання. Яму значна лягчэй, чым яго калегу са стацыянара, даюцца арганізацыйныя навукі. Дык чаму ж далёка не заўсёды гэта праяўляецца на практыцы? Вядома, што завочная форма навучання, яе вучэбныя планы разлічаны на асоб, работа якіх адпавядае выбранай спецыяльнасці. Але сярод студэнтаў-завочнікаў нямала такіх, хто не толькі паступіў у ВНУ не па профілю сваёй працы, але і пасля яе заканчэння не імкнецца мяняць сваёй ранейшай спецыяльнасці.

Дыплом настаўніка, напрыклад, атрымліваюць выпускнікі, якія маюць недастатковыя веды, таму што на працягу вучобы не займаліся непасрэднай педагагічнай дзейнасцю. І гэта ў той час, калі патрабаванні да практычнай і навукова-метадычнай падрыхтоўкі настаўніка з кожным днём узрастаюць.

Што ж супрацьпаставіць гэтай негатыўнай тэндэнцыі? Ва універсітэце вядзецца работа па ўпарадкаванню камплектавання і захавання кантынгенту студэнтаў-завочнікаў. Мы лічым, што адзін з важнейшых рэзерваў паляпшэння падрыхтоўкі спецыялістаў на завочным факультэце,—прыцягненне на педагагічныя спецыяльнасці тых, хто закончыў педвучылішча і мае стаж работы. Настаўнікі з сярэдняй спецыяльнай адукацыяй у той або іншай меры засвоіўшыя практычную педагогіку, палюбіўшыя сваю справу і павінны скласці асноўны кантынгент студэнтаў-завочнікаў. Важным рэзервам для камплектавання педагагічных спецыяльнасцей з'яўляюцца і тыя, хто працуе ў школе і яшчэ не мае педагагічнай адукацыі ці толькі што вырашыў стаць настаўнікам. Карацей кажучы, на завочны факультэт павінны паступаць тыя, для каго ён прызначаны, хто ў ім мае найбольшую патрэбу. Мы лічым, што агульнымі намаганнямі універсітэта, абласнога аддзела народнай асветы і абласнога інстытута ўдасканальвання настаўнікаў гэту праблему можна вырашыць паспяхова.

Надзейным сродкам павышэння якасці завочнага навучання служыць чоткая, рытмічная арганізацыя вучэбных заняткаў, прыцягненне для работы на завочным факультэце высокакваліфікаваных выкладчыкаў. Нельга забываць, што кожныя аўдыторныя заняткі са студэнтамі-завочнікамі павінны адыгрываць значна большую ролю, чым пры стацыянарным навучанні, бо за кароткі час выкладчыку тут неабходна не толькі растлумачыць асноўны навуковы змест вучэбнай дысцыпліны, але і правільна сарыентаваць студэнта на самастойную работу, забяспечыць ёй працяглы і важкі імпульс.

Цяпер вучэбны працэс на завочным факультэце ГДУ ажыццяўляюць 306 выкладчыкаў. Большая палавіна з іх мае вучоныя ступені і званні. Завочнікам чытаюць лекцыі 7 дактароў навук, прафесараў. Істотная работа праводзіцца па павышэнню ідэйна-палітычнага і навукова-метадычнага ўзроўню лекцыйных, семінарскіх і практычных заняткаў. Шырэй сталі практыкавацца адкрытыя лекцыі, абмеркаванне іх тэкстаў, напісаных спецыяльна для завочнікаў.

Мы адмовіліся ад такой практыкі, калі ў пачатку лабараторна-экзаменацыйнай сесіі студэнтам чыталіся аглядныя лекцыі, а ў апошнія яе дні на экзаменах правяраліся набытыя веды. Цяпер вучэбнымі планамі прадугледжана, каб выкладчыкі чыталі ў канцы кожнай сесіі ўстановачныя лекцыі па тых дысцыплінах, якія належыць вывучаць у наступным семестры, а ў пачатку новай сесіі студэнты, якія выканалі практычныя і лабараторныя работы, здаюць залікі і экзамены. Пасля гэтага яны зноў слухаюць установачныя лекцыі па дысцыплінах будучага семестра. Такім чынам, мы ставім завочнікаў ва ўмовы, якія прымушаюць іх разлічваць пры падрыхтоўцы да экзаменаў толькі на сваю работу з падручнікамі ў міжсесійны перыяд. Нам добра вядома, што глыбіня ведаў студэнта-завочніка кожны раз у многім залежыць ад актыўнасці і мэтанакіраванасці яго самастойнай работы. Таму важна дапамагчы студэнтам авалодаць метадамі самастойнай вучэбнай работы і арганізацыі разумовай працы наогул, ажыццявіць сістэматычнае педагагічнае кіраўніцтва самастойнымі заняткамі студэнтаў-завочнікаў у міжсесійны перыяд. Відавочна, ёсць неабходнасць падрыхтаваць метадычны дапаможнік, у якім былі б выкладзены парады аб тым, як слухаць і канспектаваць лекцыі, карыстацца літаратурай бібліятэкі, скласці план, напісаць тэзісы, канспект прачытанага, як рыхтавацца да семінара, залікаў, экзаменаў і г. д.

Адной з самых галоўных умоў нармальнай самастойнай вучобы завочнікаў з'яўляецца наяўнасць вучэбнай літаратуры. Але падручнік — гэта мінімум. Было б вельмі добра, калі б наша бібліятэка выдавала кожнаму студэнту не толькі поўны камплект падручнікаў, але і вучэбныя дапаможнікі і неабходныя метадычныя ўказанні.

Будаваць свае самастойныя заняткі ў міжсесійны перыяд нашым студэнтам дапамагаюць складзеныя ў нас вучэбныя графікі, якія прадугледжваюць парадак дамашніх заданняў, паслядоўнасць вывучэння дысцыплін, своечасовае выкананне кантрольных заданняў. Практычна яны служаць важным інструментам кіравання самастойнай работай студэнтаў і садзейнічаюць таму, каб яна стала для завочніка ўсвядомленай неабходнасцю.

Істотную дапамогу ў стымуляванні вучэбных намаганняў завочнікаў павінны аказаць саветы садзейнічання завочнаму навучанню. Пакуль што яны арганізаваны толькі ў двух раёнах нашай вобласці — Рэчыцкім і Лоеўскім.

Члены савета актыўна ўдзельнічаюць у адборы кандыдатаў для накіравання на вучобу ва універсітэт, цікавяцца вучобай кожнага студэнта, садзейнічаюць стварэнню спрыяльных умоў для паспяховага спалучэння завочнікамі вучобы і работы. Такія саветы неабходна стварыць ва ўсіх раёнах нашай вобласці.

Эфектыўнымі, на наш погляд, для стымулявання самастойнай вучэбнай работы завочнікаў павінны стаць розныя меры заахвочвання: падзяка ў загадзе, пісьмо кіраўніку прадпрыемства, дырэктару школы, віншаванні са знамянальнымі датамі. Карацей кажучы, размова ідзе аб неабходнасці стварэння спрыяльнага мікраклімату пры высокай патрабавальнасці з боку педагогаў, метадыстаў.

Рашэнне гэтых і шэрагу іншых пытанняў навучання без адрыву ад вытворчасці будзе садзейнічаць паляпшэнню важнейшай формы падрыхтоўкі высокакваліфікаваных спецыялістаў.

## ЛЕНІНСКІЯ СТЫПЕНДЫЯТЫ— ГОРДАСЦЬ УНІВЕРСІТЭТА



На матэматычным факультэце нямала студэнтаў, якія выдатна вучацца, вызначаюцца актыўнасцю ў грамадскім жыцці. Сярод іх — ленінская стыпендыятка Алена Цімашэнка. Яшчэ ў школьныя гады яна выхавала ў сабе працалюбства, пачуццё вялікай адказнасці за кожную справу. Алена закончыла з залатым медалём гомельскую СШ № 45 і паступіла на матэматычны факультэт, дзе набывае спецыяльнасць «Прыкладная матэматыка». Камсамолка настойліва авалодвае выбранай прафесіяй, з'яўляецца старастай групы МП-35. Яна заслужана карыстаецца аўтарытэтам і павагай сярод студэнтаў і выкладчыкаў.

**На здымку: ленінская стыпендыятка Алена Цімашэнка.**

*На абласной канферэнцыі настаўнікаў-стажораў*

## ВОПЫТ — МАЛАДЫМ

У дні вясновых канікул школьнікаў дэканат прафарыентацыі і стажорскай практыкі універсітэта сумесна з Гомельскім абласным аддзелам народнай асветы і абласным інстытутам удасканальвання настаўнікаў правёў абласную навукова-практычную канферэнцыю настаўнікаў-стажораў па авалодванню педагагічным майстэрствам. У яе рабоце прынялі ўдзел 143 маладыя настаўнікі, выпускнікі ВНУ 1984 года, якія працуюць у сістэме народнай асветы Гомельшчыны. Асабліва важнае значэнне надавалася ажыццяўленню пастановы ЦК КПСС і Савета Міністраў СССР «Асноўныя напрамкі рэформы агульнаадукацыйнай і прафесіянальнай школы».

Пленарнае пасяджэнне адкрыў і выступіў з дакладам «Задачы вышэйшых навучальных устаноў па ўдасканальванню якасці падрыхтоўкі спецыялістаў» прарэктар ГДУ па вучэбнай рабоце член-карэспандэнт АН БССР, прафесар Л. А. Шамяткоў.

Змястоўнымі і цікавымі былі даклады дырэктара абласнога інстытута ўдасканальвання настаўнікаў Л. А. Зарэцкай, загадчыка кафедры педагогікі і псіхалогіі ГДУ члена-карэспандэнта АПН СССР, прафесара І. Ф. Харламава, прарэктара па завочнаму навучанню універсітэта, дацэнта Л. Н. Сечкі, загадчыка кафедры навуковага камунізму, дацэнта А. П. Касьяненкі, заслужанай настаўніцы БССР выкладчыцы гісторыі СШ № 28 г. Гомеля І. Л. Ведзянеевай.

Упершыню на падобных канферэнцыях для настаўнікаў-стажораў была праведзена работа секцыі класнага кіраўніка. З дакладам «Задачы класнага кіраўніка па ўдасканальванню выхаваўчай работы ў святле пастановы ЦК КПСС «Аб далейшым паляпшэнні партыйнага кіраўніцтва камсамолам і павышэнні яго ролі ў камуністычным выхаванні моладзі» выступіла дацэнт кафедры педагогікі і псіхалогіі універсітэта А. В. Саннікава. Дзелавая гульня «Пазіцыя класнага кіраўніка пры правядзенні піянерскага збора і камсамольскага сходу» падвяла вынікі работы секцыі. Для правядзення дзелавой гульні былі прыцягнуты работнікі Гомельскага абкома ЛКСМБ і абласнога Палаца піянераў і школьнікаў.

Першы дзень работы канферэнцыі завяршыўся сустрэчай маладых настаўнікаў-стажораў з выпускнікамі універсітэта 1985 года. Самадзейныя артысты ГДУ выступілі з канцэртам.

У наступны дзень канферэнцыі адбыліся секцыйныя пасяджэнні па 10 спецыяльнасцях. Найбольш кваліфікаваныя супрацоўнікі універсітэта, лепшыя настаўнікі школ вобласці прынялі ўдзел у іх рабоце.

На канферэнцыі настаўнікі-стажоры атрымалі вычарпальныя адказы на ўсе цікавячыя іх пытанні.

У рабоце канферэнцыі прыняў удзел загадчык аддзела навукі і навучальных устаноў абкома КПБ Б. М. Збароўскі.

**В. СЕЛІВАНАЎ,**
**дэкан факультэта прафарыентацыі і стажорскай практыкі.**

*Студэнцкія канферэнцыі*

# ВЕЛІЧ ПРЫРОДЫ

НА біялагічным факультэце адбылася XIV студэнцкая навуковая канферэнцыя, прысвечаная 40-годдзю Перамогі савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне. На чатырох секцыях — заалогіі і аховы прыроды, батанікі і фізіялогіі раслін, фізіялогіі чалавека і жывёлін, хіміі — было заслухана 52 даклады. Актыўны ўдзел у канферэнцыі прынялі студэнты малодшых курсаў. Падрыхтавалі 8 дакладаў і студэнты-завочнікі. На традыцыйным конкурсе прызавыя месцы занялі С. Рыдны, І. Каваленка, Я. Конахаў, чацвёртакурсніца завочнага факультэта А. Фралова.

У час работы канферэнцыі была адкрыта фотавыстаўка «Чалавек і прырода», арганізаваная заалагічным гуртком і Дружынай па ахове прыроды. На ёй было прадстаўлена 148 лепшых здымкаў, зробленых студэнтамі, аспірантамі і выкладчыкамі факультэта. Усе здымкі аб'ядноўвала агульная думка, выказаная вядомым педагогам В. А. Сухамлінскім: «Чалавек стаў чалавекам, калі пачуў шэпт лісця і песню коніка, журчанне вясенняга ручая і звон срэбных званочкаў жаўранкаў у бяздонным летнім небе, шорах сняжынак і завыванне завірухі за акном, ласкавы плёскат хвалі і ўрачыстую цішыню ночы...»

У фотаздымках адлюстравана веліч прыроды ва ўсіх яе праявах. Гэта і магутны зубр (фота Я. Я. Падутава), і «Карабельны лес» (Г. Высоцкага), і галінка вішні, якая распускае свае пялёсткі, і палыхаючы захад над ракой (фота А. Сілінай), і белізна снягоў у гарах (фота П. Лазаковіча). Веліч, прыгажосць прыроды нікога не пакідае абыякавым, таму такім захапленнем ззяюць вочы малыша, які гуляе са шчанём («Юны кінолаг») і падлетка, які разглядае вялізнага сома («На Волзе») на здымках Я. Я. Падутава, студэнтаў, якія адпускаюць акальцаванага бусла — («Ты вазьмі мяне з сабой») — (здымак П. Лазаковіча).



У кнізе водгукаў выстаўкі з'явілася шмат цёплых слоў наведвальнікаў аб убачаным.

Асаблівую цікавасць выклікала экспазіцыя з фотаздымкаў, прадстаўленых асістэнтам кафедры батанікі і фізіялогіі раслін кандыдатам біялагічных навук А. У. Гаўрылавым «У аб'ектыве — народная рэспубліка Мазамбік». На здымках адлюстраваны прыродныя ўмовы, раслінны і жывёльны свет афрыканскай рэспублікі. Больш падрабязна гэтая экспазіцыя была прадстаўлена на адным з пасяджэнняў батанічнага гуртка, дзе дэманстраваліся таксама слайды і натуральныя аб'ектывы расліннага свету Мазамбіка (на здымку).

Фотавыстаўка адыгрывае вялікую ролю ў выхаванні будучых спецыялістаў-біёлагаў, якія будуць перадаваць пачуццё любві да прыроды і беражлівых адносін да яе падрастаючаму пакаленню.

Вялікае дзякуй аргкамітэту канферэнцыі і выстаўкі за добрую работу, жадаем усім яе ўдзельнікам далейшых творчых поспехаў!

**Р. МАРКЕЛАВА,**
**кандыдат біялагічных навук, адказная за НДРС біялагічнага факультэта,**

**У. ПАТЭНКА, студэнт 4-га курса, член Савета НДРС біяфака.**

## АДБЫЛІСЯ ВУЧЭННІ

На гэтым тыдні ва універсітэце адбыліся двухдзённыя каманднa-штабныя вучэнні і аб'ектавыя трэніроўкі па грамадзянскай абароне. Прымаўшыя ў іх удзел фарміраванні паспяхова справіліся з пастаўленымі задачамі, паказалі добрую падрыхтаванасць і зладжанасць ва ўзаемадзеянні.

## СУСТРЭЧА Ў ІНТЭРНАЦЕ

Выкладчыкі кафедр арганізацыі механізаванай апрацоўкі эканамічнай інфармацыі і эканомікі працы правялі ў інтэрнаце № 4 сустрэчу са студэнтамі факультэта. На ёй абмяркоўваліся пытанні ідэйнай і палітыка-выхаваўчай работы, якая вядзецца са студэнцкай моладдзю.

На шматлікія пытанні жыхароў інтэрната давалі адказы дэкан эканомфака У. Д. Арэшчанка, дацэнт кафедры АМАЭІ В. А. Трухаў, а таксама выкладчыкі А. А. Скорава, Г. К. Балтрушэвіч, Т. І. Іванова і інш.

**А. БЫЧЭНКА,**
**асістэнт кафедры АМАЭІ.**

*спорт*

## У ПРЫЗЁРАХ— АСІЛКІ

У Гомелі праведзены спаборніцтвы па вольнай барацьбе беларускага спартыўнага таварыства «Буравеснік», якія прысвячаліся 40-годдзю Перамогі савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне. На дыван выйшлі прадстаўнікі 20 вышэйшых навучальных устаноў рэспублікі. Агульнакамандную перамогу заваявалі спартсмены Беларускага інстытута народнай гаспадаркі імя В. В. Куйбышава. Другую суму ачкоў набралі барцы нашага універсітэта. Трэцім прызёрам у агульным заліку стала каманда Беларускага інстытута фізічнай культуры.

Сярод нашых барцоў найбольш паспяхова выступіў студэнт эканамічнага факультэта Віктар Падольскі (вагавая катэгорыя да 82 кг). Ён стаў пераможцам спаборніцтваў.

На другую прыступку п'едэстала гонару пасля праведзеных паядынкаў узняліся Сяргей Смаль і Мікалай Бурнашоў, на трэцюю — Мікалай Доктараў і Павел Нікалаеў. Усе яны выхаванцы ДЮСШ пры спортклубе ГДУ.

**А. ХАТЫЛЕЎ,**
**трэнер каманды.**

●

## ЛЁГКААТЛЕТЫЧНЫ КРОС

У мінулую нядзелю адбыўся абласны лёгкаатлетычны крос, прысвечаны 40-годдзю Вялікай Перамогі. У ім прынялі ўдзел і каманды ўсіх факультэтаў нашага універсітэта. Мацнейшымі ў агульным заліку сталі лёгкаатлеты факультэта фізвыхавання.

Сярод жанчын на дыстанцыі 1 км лепшы вынік паказала Т. Кутасава з матэматычнага факультэта. І. Ляшкова з факультэта фізвыхавання паказала другі вынік. Яе таварыш па камандзе першакурснік В. Дымар таксама стаў другім прызёрам у забегу на 3 км.

# ЗАВОЧНЫ ФАКУЛЬТЭТ ГДУ АБ'ЯЎЛЯЕ ПРЫЁМ

## СТУДЭНТАЎ НА 1985—1986 НАВУЧАЛЬНЫ ГОД

НА НАСТУПНЫЯ СПЕЦЫЯЛЬНАСЦІ:

**беларуская і руская мова і літаратура, руская мова і літаратура, гісторыя, біялогія, фізічнае выхаванне, матэматыка, эканоміка працы, арганізацыя механізаванай апрацоўкі эканамічнай інфармацыі.**

Прыём заяў на спецыяльнасці беларуская і руская мова і літаратура, руская мова і літаратура, гісторыя, біялогія, фізічнае выхаванне, матэматыка — **з 20 красавіка па 31 мая;** на спецыяльнасці эканоміка працы, арганізацыя механізаванай апрацоўкі эканамічнай інфармацыі — **з 20 красавіка па 31 жніўня.**

Уступныя экзамены на спецыяльнасці беларуская і руская мова і літаратура, руская мова і літаратура, гісторыя, фізічнае выхаванне, біялогія, матэматыка — **з 1 па 20 чэрвеня;** на спецыяльнасці эканоміка працы, арганізацыя механізаванай апрацоўкі эканамічнай інфармацыі — **з 15 мая па 10 верасня.**

Залічэнне ў састаў студэнтаў на спецыяльнасці беларуская і руская мова і літаратура, руская мова і літаратура, гісторыя, біялогія, фізічнае выхаванне, матэматыка — **з 21 па 30 чэрвеня;** на спецыяльнасці эканоміка працы, арганізацыя механізаванай апрацоўкі эканамічнай інфармацыі — **з 21 жніўня па 20 верасня.**

Паступаючыя ва універсітэт здаюць уступныя экзамены ў залежнасці ад абранай спецыяльнасці па наступных дысцыплінах:

на спецыяльнасць беларуская і руская мова і літаратура — беларускай мове і літаратуры (вусна), гісторыі СССР (вусна), рускай мове і літаратуры (вусна), рускай мове і літаратуры або беларускай мове і літаратуры (пісьмова).

на спецыяльнасць руская мова і літаратура — рускай мове і літаратуры (пісьмова і вусна), замежнай мове (вусна), гісторыі СССР (вусна);

на спецыяльнасць гісторыя — рускай мове і літаратуры або беларускай мове і літаратуры (пісьмова і вусна), гісторыі СССР (вусна), замежнай мове (вусна);

на спецыяльнасць матэматыка — матэматыцы (пісьмова і вусна), фізіцы (вусна), рускай мове і літаратуры або беларускай мове і літаратуры (пісьмова);

на спецыяльнасць эканоміка працы — матэматыцы (вусна), гісторыі СССР (вусна), геаграфіі (вусна), рускай мове і літаратуры або беларускай мове і літаратуры (пісьмова);

на спецыяльнасць арганізацыя механізаванай апрацоўкі эканамічнай інфармацыі — па матэматыцы (пісьмова і вусна), фізіцы (вусна), рускай мове і літаратуры або беларускай мове і літаратуры (пісьмова);

на спецыяльнасць біялогія — біялогіі (вусна), хіміі (вусна), матэматыцы (вусна), рускай мове і літаратуры або беларускай мове і літаратуры (пісьмова);

на аддзяленне фізічнага выхавання — па спецыяльнасці (лёгкая атлетыка, гімнастыка, плаванне), біялогіі (вусна), хіміі (вусна), рускай мове і літаратуры або беларускай мове і літаратуры (пісьмова).

Узнагароджаныя па заканчэнні сярэдняй школы залатым (сярэбраным) медалём або скончыўшыя сярэднюю спецыяльную навучальную ўстанову ці прафтэхвучылішча з дыпломам з адзнакай, здаюць толькі адзін з устаноўленых для адпаведнай спецыяльнасці ўступных экзаменаў, а іменна:

па спецыяльнасці беларуская і руская мова і літаратура — беларускай мове і літаратуры (вусна);

па спецыяльнасці руская мова і літаратура — рускай мове і літаратуры (вусна);

па спецыяльнасці гісторыя — па гісторыі СССР (вусна);

па спецыяльнасцях: матэматыка, арганізацыя механізаванай апрацоўкі эканамічнай інфармацыі, эканоміка працы, біялогія — матэматыцы (вусна);

на аддзяленне фізічнага выхавання — па спецыяльнасці (лёгкая атлетыка, гімнастыка, плаванне).

Пры здачы экзаменаў з адзнакай «пяць» абітурыент вызваляецца ад здачы астатніх экзаменаў, а пры атрыманні адзнакі «чатыры» або «тры» здае астатнія экзамены.

Уступныя экзамены праводзяцца па праграмах, зацверджаных Міністэрствам вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі, у адпаведнасці з праграмай сярэдняй агульнаадукацыйнай школы.

Заява аб прыёме падаецца на імя рэктара універсітэта па адзінай форме (дадатак № 2 да Правілаў прыёму ў вышэйшыя навучальныя ўстановы СССР). Да заявы прыкладваюцца: дакумент аб сярэдняй адукацыі (у арыгінале), характарыстыка з апошняга месца работы для паступлення ва універсітэт, выпіска з працоўнай кніжкі, завераная гербавай пячаткай, медыцынская даведка (форма № 86/у), 4 фатакарткі (здымкі без галаўнога ўбора размерам 3×4 см).

Пашпарт і дакумент аб адносінах да воінскага абавязку паступаючыя прад'яўляюць у прыёмную камісію асабіста па прыбыцці ў ВНУ.

На завочны факультэт у першую чаргу залічваюцца асобы, характар работы якіх адпавядае абранай у ВНУ спецыяльнасці, і калі яны працуюць па гэтай спецыяльнасці не менш шасці месяцаў, а таксама выпускнікі сярэдніх спецыяльных і прафесійна- тэхнічных навучальных устаноў, якія паступаюць на родныя спецыяльнасці, звольненыя ў запас ваеннаслужачыя.

Дакументы накіроўваць па адрасу: 246699, г. Гомель, вул. Савецкая, 108, універсітэт, прыёмнай камісіі, т. 57-11-17.

Яўка на ўступныя экзамены — па выкліку універсітэта.

**РЭКТАРАТ.**

Рэдактар Ул. БАЛОГА.

«Гомельский университет» — орган парткома, ректората, комитета ЛКСМБ и профкомов Гомельского государственного университета (на белорусском языке), Гомельская фабрыка «Палесдрук» Дзяржкамітэта БССР па справах выдавецтваў, паліграфіі і кніжнага гандлю. Гомель, Савецкая, 1. Аб'ём — 1 друк. аркуш. Тыраж 2000 экз.
Наш адрас: вул. Савецкая, 104, п. 3-11, т. 57-16-52.

АЗ 22324

Заказ. 1556